# «БІБЛІЯНОЧ-2019», АБО СУМАВАЦЬ НЕ БЫЛО КАЛІ



Пятніца. Вечар. Бібліятэка. Вось тры складнікі паспяховага мерапрыемства. У гэтым маглі ўпэўніцца ўсе наведвальнікі «Бібліяночы-2019», якая прайшла 19 красавіка ў нашай альма-матар.

А гасцей было нямала: беларускія студэнты, хлопцы і дзяўчаты факультэта навучання замежных грамадзян, выкладчыкі, прадстаўнікі адміністрацыі ўніверсітэта і гараджане. У бібліятэку прыйшлі цэлымі сем'ямі і не прагадалі: цікавы занятак для сябе мог знайсці кожны.

«"Бібліяноч" — гэта ўжо фішка нашага ўніверсітэта, мерапрыемства, якім мы па праве можам ганарыцца, — адзначыла першы прарэктар, доктар эканамічных навук, прафесар Валянціна Васільеўна Багатырова. — Тэматыка сённяшняга вечара — любоў да малой радзімы. І гэта невыпадкова, бо трэба любіць тое месца, дзе ты нарадзіўся і жывеш. Я ж хачу



пажадаць усім атрымаць асалоду ад гэтага цудоўнага мерапрыемства. Упэўнена, так яно і будзе».

Сучасныя квэсты, займальныя віктарыны, танцавальныя пляцоўкі, музычна-паэтычны «Кватэрнік», псіхадыягностыка, настольныя гульні, «Горад майстроў» з шаржамі і мехендзі, робататэхніка, духмяная гарбата і салодкія прысмакі, фотазона, дзе можна было зрабіць здымак на памяць у народным строі і паваражыць, экскурсія ў планетарый — гэта далёка не поўны пералік таго, чым здзіўлялі наведвальнікаў «Бібліяночы» ў той вечар.

Сапраўды, сумаваць не было калі. Некалькі гадзін праляцелі як адно імгненне.



Госці няспешна разыходзіліся і дзівіліся, як у арганізатараў «Бібліяночы» хапае столькі фантазіі штогод прыдумляць нешта новае. І пры гэтым ніхто не сумняваўся: наступным разам будзе яшчэ цікавей!

**На здымках:** падчас «Бібліяночы-2019».

**Фота і тэкст**
**Алесі ДУБРОЎСКАЙ.**